страховых компаний, германский профсоюз почтовых служащих, профсоюз работников СМИ и германский профсоюз служащих [9, с. 16].

Таким образом, реформы затронули все аспекты трудового законодательства и дали как положительный, так и отрицательный эффект. Несмотря на проведенные мероприятия ситуация к 2002 г. ухудшилась. Число безработных в среднем за год превысило 4 млн. человек. Вместе с тем, наблюдался и позитивный результат. 1 октября 2000 г. вступил в силу закон о борьбе с безработицей среди лиц с ярко выраженными физическими и умственными недостатками, что привело к сокращению безработицы в данной социальной группе. В результате поддержки ФВВТ пожилых людей, в период с 2001–2002 гг. число безработных старше 50 лет заметно снизилось. Благодаря активным усилиям федерального правительства право иностранцев на работу получило новое законодательное оформление. Были созданы условия для активного поиска места работы лицами ее не имеющими, а предпочитавшими получать пособие по безработице. Условия его выдачи также претерпели изменения. О перспективности проведенных преобразований свидетельствует и тот факт, что федеральное правительство Ангелы Меркель, сменившее «красно-зеленую» коалицию в 2005 г., не свернуло начатых предыдущим кабинетом реформ в области рынка труда.

**Литература**


1. *Зайферт Х.* Труд меняется // Deutschland. 2001. № 2. С. 16–17.
2. Германия. Факты. Берлин, 2003. С. 480.
3. *Зинн Х.-В.* Германия нуждается в реформах // Мировая экономика и международные отношения. 2000. № 1. С. 96–102.
4. *Орт М.* Интервью с Вальтером Ристером // Deutschland. 1999. № 2. С. 10–13.
5. *Маршал М.* Greencard // Deutschland. 2000. № 3. С. 10–11.
6. *Маршал М.* Интервью с Эдельгард Бульман // Deutschland. 2000. № 3. С. 10–11.
7. Закон «Job-Aqtiv» // Deutschland. 1999. № 2. С. 57.
8. *Marshal M.* Zukunftsprogramm // Deutschland. 1999. № 4. S. 9–10.
9. Единый профсоюз работников сферы услуг // Deutschland. 2001. № 3. С. 16.


## ВЫВУЧЭННЕ ЖЫЛЫХ АБ’ЕКТАЎ НА ПАСЕЛІШЧАХ КАМЕННАГА ВЕКУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ


**В. У. Ашэйчык**


Узнікненне жытла звязана з пачаткам развіцця чалавечых супольнасцяў. Яно з’яўляецца адной з асноўных матэрыяльных умоваў існавання чалавека, і таму заўсёды было адной з самых важных частак матэрыяльнай культуры.

Вывучэнне рэшткаў старажытных жылых канструкцый даволі шырока распаўсюджана ў археалогіі. Будучы цесна звязанымі з рознымі бакамі культуры, жытло адлюстроўвае шматлікія аспекты існавання чалавечых супольнасцяў. Гэта робіць звесткі аб старажытных жытлах важнай крыніцай для вывучэння дагістарычных грамадстваў. У прыватнасці, для рэканструкцыі схемаў грамадскіх адносін, механізмаў адаптацыі і жыццезабеспячэння, заканамернасцяў рассялення і пасяленчай структуры, шэрагу аспектаў палеадэмаграфіі і палеаэканомікі [1; 2, с. 110–124].

За гады археалагічнага вывучэння тэрыторыі Беларусі на паселішчах каменнага веку была даследавана пэўная колькасць жылых аб’ектаў. Большая частка атрыманых матэрыялаў апублікавана разам з іншымі вынікамі палявых даследаванняў у працах У. Ф. Ісаенкі, А. Г. Калечыц, В. Ф. Капыціна, У. П. Ксяндзова, М. М. Чарняўскага [3; 4; 5; 6; 7; 8; 9]. Аднак, на сённяшні дзень не існуе працы, прысвечанай абагульненню і комплекснаму даследаванню гэтых матэрыялаў.

Аўтарам у ходзе вывучэння гаспадарча-бытавых комплексаў на паселішчах каменнага веку быў сабраны ўвесь апублікаваны матэрыял па жытлах і зроблена яго першаснае абагульненне. Вынікі гэтай працы і прапануюцца ў дадзеным артыкуле.

Найстарэйшымі вядомымі нам паселішчамі чалавека на тэрыторыі Беларусі з’яўляюцца Юравіцкая і Бердыжская (Падлужжа 1) верхнепалеалітычныя стаянкі. Існавалі пэўныя падставы для меркавання аб наяўнасці на абодвух помніках рэшткаў старажытных жытлаў. Аўтарам былі крытычна прааналізаваны усе апублікаваныя матэрыялы, датычныя праблемы, у выніку чаго зроблена выснова аб недаказанасці такіх меркаванняў. Магчымасць існавання жытлаў на названых стаянках не выключаецца, але якіх-небудзь дакладных звестак, што дазволілі б даць ім канкрэтныя характарыстыкі, адсутнічаюць [10].

Па літаратурных крыніцах на тэрыторыі Беларусі вядома каля 50 фінальнапалеа-літычных і каля 100–150 мезалітычных паселішчаў і месцазнаходжанняў. З іх раскопкамі даследаваліся некалькі дзесяткаў. На сённяшні дзень выяўлены рэшткі 11 жытлаў на 6 стаянках эпохі фінальнага палеаліту і мезаліту (Берасценава, Лудчыцы, Стасеўка, Берагавая Слабада, Аўрамаў Бугор, Бабулін Бугор).

Адносна невялікая колькасць выяўленых жытлаў тлумачыцца шэрагам прычынаў. Па-першае, пераважная большасць вядомых помнікаў вывучалася толькі павярхнёвымі зборамі і шурфоўкай, а не раскопкамі. Пры гэтым толькі апошні метад дазваляе выявіць рэшткі старажытных жытлаў. Па-другое, на значнай колькасці з вядомых помнікаў гарызонт залягання культурных рэшткаў у пазнейшыя часы парушаўся і куль-

турны слой быў часткова ці цалкам разбураны. Па-трэцяе, умовы залягання культурных рэшткаў на паселішча гэтага часу ў большасці сваёй неспрыяльныя для захавання арганічных матэрыялаў. Апошнія ж у асноўным і выкарыстоўваліся ў будаўніцтве.

Рэшткі жытлаў на старажытных паселішчах захаваліся ў выглядзе лінзаў пяску больш цёмнай, адрознай ад навакольнай, афарбоўкі, насычаных у большай ці меншай ступенях рэшткамі вугалля і попелу. Яны мелі дыяметр большы за 2 м і былі заглыблены ў стэрыльны слой. Звычайна такія аб'екты атаясамліваюць з рэшткамі паўзямлянкавых жытлаў – «земляных чумаў». Магчыма, некаторыя з іх – гэта сляды «тапталішчаў» вакол вогнішчаў, а самі жытлы мелі крыху большыя памеры [11, с. 120]. Аналагічныя жытлы з'яўляюцца тыповымі для помнікаў фінальнага палеаліту – мезаліту лясной паласы Еўропы [11, с. 119–125; 12, с. 141].

Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі выяўлены паўзямлянкавыя жытлы круглай ці авальнай формы (за выключэннем аднаго простакутнага ў плане). У аснове канструкцыі – жыллёвая яма з чашападобным профілем, заглыбленая ад старажытнай дзённай паверхні ў сярэднім на 0,3–0,5 м (да 0,7 м). Памеры для круглых складалі 2–2,5 м у дыяметры, для авальных – каля 3 м у даўжыню. Два аб'екты былі большыя і мелі 5 м у дыяметры для круглага (Стасеўка), і звыш 5 м у даўжыню для авальнага (Берасценава). Плошча цэнтральных частак жытлаў складала ў сярэднім 5–7 кв. м (да 13 кв. м). Унутры ці ў непасрэднай блізкасці звонку жытлаў знаходзілася вогнішча, звычайна невялікіх памераў.

Асаблівую цікавасць ўяўляе жылы комплекс з паселішча Берагавая Слабада. Тут выяўлены рэшткі простакутнай паўзямлянкі плошчай 16 кв. м, побач з якой знаходзілася яшчэ адно паўзямлянкавае збудаванне (авальнай формы) з адметнымі канструктыўнымі асаблівасцямі – складалася з двух камер, меншая з якіх служыла дапаможным памяшканнем альбо ўваходам. Размяшчэнне выяўленых побач слядоў ад апорных слупоў дазваляе меркаваць аб магчымым існаванні навеса, які накрываў комплекс з двух збудаванняў.

Неалітычных помнікаў на тэрыторыі Беларусі вядома некалькі соцень, дзесяткі з іх даследаваліся раскопкамі. Існуе дакладная інфармацыя аб выяўленні рэшткаў 18 жытлаў на 9 паселішчах (Востраў 1, Трахімавы Кусты, Перасудавічы 1, Добры Бор 1, Ліцвін 1, Ліцвін 2, Мішурова Грыва, Лоша 1, Лоша 2).

Усе зафіксаваныя жылыя аб'екты – рэшткі паўзямлянкавых жытлаў, што мелі круглую і авальную ці прастакутную (тры аб'екты на паселішчы Добры Бор 1, адно на помніку Ліцвін 2) форму. Памеры іх складалі ў

ранні перыяд неаліту 2,2–3 м, у позні – 2,5–3,8 м. Глыбіня жыллёвых ямаў ад узроўню старажытнай дзённай паверхні вагалася ад 0,1 да 1–1,25 м, але ў сярэднім складала не менш за 0,5 м. Большасць жытлаў мела ўнутры агнішчы адкрытага тыпу, уладкаваныя ў заглыбленні падлогі. У жытлах, датаваных познім неалітам, фіксуецца з'яўленне новай канструктыўнай дэталі – ямы-пограба, заглыбленай ў падлогу, дыяметрам да 0,6 м і глыбінёй да 1 м (Лоша 2).

Акрамя паўзямлянак на паселішчах каменнага веку, напэўна, існавалі і наземныя жытлы. М. М. Чарняўскі звяртае ўвагу на магчымае існаванне жытла слупнай канструкцыі на помніку Нясілавічы 6 [9, с. 21]. У. Ф. Ісаенка робіць высновы аб існаванні наземных жытлаў на помніках Опаль 2, Вяз 1, Камень 2, Камень 6, Слабодка 1 на падставе асаблівасцяў размяшчэння старажытных агнішчаў і канцэнтрацыі культурных рэшткаў у раскопе [3, с. 29, 59, 77; 13, с. 132, 164–165].

Фіксацыя рэшткаў старажытных наземных жытлаў з'яўляецца моцна ўскладненай. У адрозненні ад паўзямлянак, жыллёвыя ямы якіх з цягам часу заносіліся пяском і на іх месцы ў постдэпазіцыйным стане захоўваліся характэрныя лінзы запаўнення, наземныя жытлы знікалі, не пакідаючы слядоў [11, с. 119]. Іх вызначэнне ў большасці выпадкаў магчыма па размяшчэнні слядоў ад слупных ямаў і агнішчаў.

Падводзячы вынік, неабходна зазначыць, што асноўным тыпам выяўленых жытлаў эпохі фінальнага палеаліту – мезаліту на тэрыторыі Беларусі была круглая ці авальная паўзямлянка. З цягам часу адбываецца развіццё гэтай формы у бок павелічэння памераў і заглыбленасці. Хутчэй за ўсё, старажытным насельніцтвам шырока выкарыстоўваліся і наземныя жытлы, ахарактарызаваць якія складана з-за амаль поўнай іх не захаванасці. Для неалітычнай эпохі характэрным, верагодна, з'яўляецца пашырэнне выкарыстання збудаванняў слупнай канструкцыі.

Таксама была зроблена выснова, што на паселішчах каменнага веку выяўляецца сувязь паміж жытламі і іншымі аб'ектамі – агнішчамі, гаспадарчымі ямамі. Разам яны ўтвараюць адзіныя гаспадарча-бытавыя комплексы, у межах даследавання якіх мэтазгодна працягваць вывучэнне уласна жылых аб'ектаў.

### Літаратура


1. *Григорьев Г. П.* Восстановление общественного строя палеолитических охотников и собирателей // Охотники, собиратели, рыболовы: Проблемы социально-экономических отношений в доземледельческом обществе / Отв. ред. А. М. Решетов. Л., 1972. С. 11–25.
2. *Массон В. М.* Экономика и социальный строй древних обществ. Л., 1976.

3. *Исаенко В. Ф.* Неолит Припятского Полесья / АН БССР, Ин-т истории; Ред. Д. Я. Телегин. Мн., 1976.
4. *Калечиц Е. Г.* Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии / Науч. ред. Д. Я. Телегин. Мн., 1987.
5. *Калечиц Е. Г.* Человек и среда обитания. Восточная Беларусь. Каменный век. Мн., 2003.
6. *Копытин В. Ф.* Памятники финального палеолита и мезолита Верхнего Поднепровья. Могилев, 1991.
7. *Ксензов В. П.* Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья / Науч. ред. Н. Н. Гурина. Мн., 1988.
8. *Ксензов В. П.* Мезолит Северной и Центральной Беларуси / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; Навук. рэд. І. М. Язэпенка. Мн., 2006.
9. *Чарняўскі М. М.* Неаліт Беларускага Панямоння / АН БССР, Ін-т гісторыі; Нав. рэд. Д. Я. Цялегін. Мн., 1979.
10. *Ашэйчык В. У.* Да пытання аб жытлах Юравіцкай і Бердыжскай верхнепалеалітычных стаянак // САЗ: Студэнцкі археалагічны зборнік / БДУ, Гістарычны ф-т; Навук. рэд. В. С. Абухоўскі. Мн., 2007. Вып. 1. С. 8–18.
11. *Зализняк Л. Л.* Население Полесья в мезолите / АН УССР, Ин-т археологии; Отв. ред. Д. Я. Телегин. Киев, 1991.
12. *Кларк Дж. Г. Д.* Доисторическая Европа: Экономический очерк / Пер. с англ. М. Б. Граковой-Свиридовой. М., 1953.
13. Археалогія Беларусі: У 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мн., 1997–2003. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі / Э. М. Зайкоўскі, У. Ф. Ісаенка, А. Г. Калечыц і інш.; Пад. рэд. М. М. Чарняўскага, А. Г. Калечыц. Мн., 1997.

## АНАЛІЗ СУЧАСНАГА СТАНУ МУЗЕЯЎ ВНУ Г. МІНСКА

**П. Ю. Бандаровіч**

У сучасным свеце ўсё большую значнасць набывае універсітэцкая адукацыя. Яе сутнасць – усебаковае развіццё асобы асобы з мэтай выхавання здольнага і перспектыўнага маладога пакалення. І для дасягнення гэтай мэты вельмі вялікая ўвага надаецца сёння універсітэцкім музеям, што недзіўна, так як яны маюць вельмі вялікі адукацыйна-выхаваўчы патэнцыял. Ужо з сярэдзіны 1990-х гг. у складзе Міжнароднага савета музеяў існуе міжнародны камітэт універсітэцкіх музеяў і калекцый, які вядзе статыстыку, выдае свой часопіс, штогод праводзіць семінары і канферэнцыі пад дахам буйнейшых універсітэцкіх музеяў свету. Нажаль, дакладных колькасных дадзеных па музеях гэтай групы ў Беларусі няма, што тлумачыцца адсутнасцю адзінага каардынацыйна-метадычнага цэнтра.

Між тым колькасць універсітэцкіх музеяў сёння павялічваецца. Напрыклад, у Мінску, дзе знаходзяцца большасць вышэйшых навучальных установ Беларусі, амаль кожная з іх мае альбо хоча мець уласны